ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 16 (990) | ЧАЦВЕР, 9 лістапада 2000 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## ВЫБАРЫ: ВЫНІК ДРУГОГА ТУРА

29 кастрычніка адбыўся другі тур выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Студэнты, якія жывуць у інтэрнатах №2 і мікрараёне "Валатава", а таксама некаторыя выкладчыкі і супрацоўнікі нашага універсітэта прымалі ўдзел у галасаванні па Гомельскай-Юбілейнай №33 выбарчай акрузе. Пасля першага тура галасавання, як мы паведамлялі ў папярэднім нумары газеты, за дэпутацкі мандат ад названай выбарчай акругі змагаліся галоўны рэдактар газеты "Гомельская праўда" В.М.Логвін і намеснік упраўляючага дзяржаўным прадпрыемствам "Трэст Гомельсаўгасбуд" С.Д.Калеснікаў, якія ў папярэднім туры набралі найбольшую колькасць галасоў. У другім туры пераможцам выйшаў В.М.Логвін, які будзе прадстаўляць наш горад у беларускім парламенце.

**На Савеце універсітэта**

## ПРАФЕСАР Л.А.ШАМЯТКОЎ – СЯРОД ЛЕПШЫХ ВУЧОНЫХ СТАГОДДЗЯ

Кастрычніцкае пасяджэнне Савета нашага універсітэта ўвойдзе асобнымі радкамі ў гісторыю вядучай вышэйшай навучальнай установы Палескага рэгіёна. Напачатку гасцінныя гаспадары цёпла віталі прадстаўнічую дэлегацыю з шатландскага горада-пабраціма Абердзіна на чале з яго мэрам пані Маргарэт Сміт. Затым урачыстасць прадоўжылася з нагоды прысуджэння ганароваму рэктару ГДУ доктару фізіка-матэматычных навук, прафесару, заслужанаму дзеячу навукі Рэспублікі Беларусь, члену-карэспандэнту НАН Беларусі Л.А.Шамяткову сярэбранага медаля "2000 выдатных вучоных XX стагоддзя", на якім выгравіравана прозвішча ўзнагароджанага.

— Мы з'яўляемся сведкамі выдатнай падзеі не толькі ў жыцці нашага універсітэта, горада, вобласці, але і ўсёй рэспублікі, — сказаў рэктар ГДУ прафесар М.В.Селькін. Міжнародны Біяграфічны Цэнтр (г.Кембрыдж, Вялікабрытанія) сёлета адзначыў дасягненні буйнейшых вучоных свету выданнем спецыяльнай кнігі, у якой асвятляецца дзейнасць і прыводзяцца біяграфічныя дадзеныя лепшых вучоных. Саветнікі і спецыяльныя камітэты названага цэнтра разгледзелі дзесяткі тысяч біяграфій і адабралі толькі 2000 з іх для ўключэння ў выдадзеную кнігу.

Значэнне і сэнс гэтай падзеі тлумачыцца ў допісе Міжнароднага Біяграфічнага Цэнтра:

"Новае стагоддзе і новае тысячагоддзе прымушаюць нас думаць пра будучае і асэнсоўваць дасягненні і здзяйсненні XX веку... Рашучая работа, такая як расказ аб падрабязнасцях жыцця і дасягненняў вялікіх мысліцеляў, будуць ілюстраваць багацце адкрытых імі магчымасцей. Міжнародны Біяграфічны Цэнтр сваёй дзейнасцю садзейнічае ажыццяўленню гэтай натхняльнай ідэі".

М.В.Селькін у сваім выступленні адзначыў, што Л.А.Шамяткоў з'яўляецца буйнейшым матэматыкам-алгебраістам. Ён — аўтар трох манаграфій і звыш 100 навуковых прац, якія апублікаваны ў Беларусі, Расіі, Германіі, Іспаніі, Вялікабрытаніі, ЗША. Леанід Аляксандравіч стварыў у Гомелі навуковую матэматычную школу, якая набыла сусветную вядомасць. Сярод яго вучняў — 29 кандыдатаў і 7 дактароў навук.



У ГДУ ён узначальвае Савет па абароне доктарскіх дысертацый па матэматычнай логіцы, алгебры і тэорыі лічбаў. Аб яго аўтарытэце сярод матэматыкаў свету сведчаць словы, выказаныя амерыканскім прафесарам Г.Бечцелам: "Я глыбока паважаю прафесара Шамяткова і як чалавека, і як матэматыка. Яго інтуіцыя і праніклівасць надзвычай глыбокія".

Высокую ўзнагароду Л.А.Шамяткову **(на здымку)** з вялікім задавальненнем уручыла пані Маргарэт Сміт і выказала ў яго адрас шчырыя віншаванні і найлепшыя пажаданні ў далейшай навуковай і педагагічнай дзейнасці.

Перад замежнымі гасцямі і членамі Савета хвалюючым было выступленне прафесара Л.А.Шамяткова. Леанід Аляксандравіч выказаў шчырую ўдзячнасць за высокую ацэнку яго навуковай дзейнасці і запэўніў, што і ў далейшым будзе ўносіць свой пасільны ўклад у айчынную і сусветную матэматычную навуку.

***

Адным з галоўных на парадку дня Савета было пытанне аб асноўных задачах універсітэта ў новым навучальным годзе. Іх грунтоўна ахарактарызаваў у сваім выступленні рэктар М.В.Селькін. Першаступеннае значэнне надаецца пераходу на новыя вучэбныя стандарты, далейшаму станаўленню спецыяльнасцей і спецыялізацый, асабліва адкрытых у апошнія гады, паглыбленню і каардынацыі навуковых даследаванняў, стварэнню спецыяльных Саветаў па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, падрыхтоўцы высокакваліфікаваных маладых кадраў, паляпшэнню маральнага клімату ў калектыве. Значная ўвага была ўдзелена выкананню Калектыўнага дагавора, аб чым выказалі свае меркаванні таксама першы прарэктар дацэнт А.П.Кармазін і старшыня прафкома Г.І.Варатніцкі. Адзначана, што ў цэлым Калектыўны дагавор з улікам фінансавых магчымасцей выконваецца.

Савет заслухаў начальніка аддзела кантрольна-рэвізійнага упраўлення Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь па г.Гомелю Т.Д.Кулікоўскую аб выніках рэвізіі фінансава-гаспадарчай дзейнасці ГДУ. Для ўхілення выяўленых недахопаў будуць распрацаваны адпаведныя мерапрыемствы.

Аб арганізацыі навучальнага працэсу па спецыяльнасці "Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны" Савет праінфармаваў загадчык кафедры эканамічных тэорый Б.У.Сарвіраў. Начальнік вучэбнага аддзела Н.І.Папкова ў сваім выступленні прааналізавала вынікі работы дзяржаўных экзаменацыйных камісій і летняй экзаменацыйнай сесіі ва універсітэце.

На конкурснай аснове на вакантныя пасады абраны дацэнтамі: А.Я.Рычкоў — па кафедры палітычнай сацыялогіі, Ю.П.Працко — па кафедры фізічнай культуры і спорту; ст.выкладчыкамі: М.Я.Цішкевіч — па кафедры палітычнай сацыялогіі, І.Т.Зайцава — па кафедры педагогікі.

Савет рэкамендаваў кандыдата філалагічных навук Н.П.Капшай з кафедры рускай літаратуры да прысваення вучонага звання дацэнт.

На пасяджэнні Савета разгледжаны шэраг іншых пытанняў універсітэцкага жыцця, па якіх прыняты адпаведныя рашэнні.

## УЗНАГАРОДЫ АЛІМПІЙЦАМ

За высокія спартыўныя дасягненні і паспяховае выступленне на XXVII Алімпійскіх гульнях Ганаровай граматай Гомельскага аблвыканкама ўзнагароджаны студэнткі нашага універсітэта майстры спорту міжнароднага класа па веславанню на байдарках і каноэ **Алеся БАКУНОВА** і **Наталля БАНДАРЭНКА**. Такой жа ўзнагароды ўдастоены былыя выхаванцы ГДУ заслужаны майстар спорту па лёгкай атлетыцы бронзавы прызёр Алімпіяды па шматбор'ю **Наталля САЗАНОВІЧ**, майстры спорту міжнароднага класа адпаведна па вольнай і грэка-рымскай барацьбе **Сяргей ДЗЕМЧАНКА** і **Вячаслаў МАКАРАНКА**, заслужаны майстар спорту па сучаснаму пяцібор'ю **Жана ШУБЯНОК**.

За высокія спартыўныя дасягненні і ўдзел у XXVII Алімпійскіх гульнях абласны выканаўчы камітэт аб'явіў падзяку студэнтцы нашага універсітэта майстру спорта міжнароднага класа па плаванню **Алене ПОПЧАНКА**.

Ушанаванне ўдзельнікаў XXVII летніх Алімпійскіх гульняў адбылося ў грамадска-культурным цэнтры Гомеля. Цёплыя словы віншаванняў выказаў у іх адрас і ўручыў Ганаровыя граматы аблвыканкама, кветкі і грашовыя ўзнагароды старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў В.Сяліцкі.

**Навуковыя канферэнцыі**

## ПРА ШЛЯХ ДА ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

Нядаўна ў г.Беластоку (Польская Рэспубліка) адбылася польска-беларуская навукова-тэарэтычная канферэнцыя "Змаганне за беларускую дзяржаўнасць у XX стагоддзі". Яе арганізавалі і правялі польскія актывісты Беларускага гістарычнага таварыства пры падтрымцы і садзейнічанні дзяржаўных і мясцовых уладаў.

Цікавасць і ўвага да нашай айчыннай гісторыі ў беластоцкіх навукоўцаў і, у прыватнасці, членаў Беларускага гістарычнага таварыства зусім не выпадковая. У Беластоцкім універсітэце шырока і плённа вядзецца распрацоўка праблем беларусазнаўства, дзейнічаюць адпаведныя кафедры, на якіх працуюць высокакваліфікаваныя спецыялісты, рыхтуюцца маладыя кадры па беларускай мове, гісторыі, культуры. Дарэчы сказаць, што адну з кафедраў узначальвае адна з такіх выдатных спецыялістаў філалагічнай навукі, як доктар, прафесар Эльжбета Смулкава, якая некалькі гадоў таму ўзначальвала пасольства Польскай Рэспублікі ў маладой суверэннай Беларусі, была ганаровым госцем Гомельскага дзяржуніверсітэта.

Задума ў арганізатараў і ўдзельнікаў канферэнцыі была, на першы погляд, простая і разам з тым даволі складаная: прасачыць рэальны і часам вельмі супярэчлівы шлях на працягу цэлага стагоддзя, які прайшла наша Бацькаўшчына ў змаганні за сваю дзяржаўнасць і самастойнасць.

Ад Беларусі на канферэнцыі выступіла больш 20 навукоўцаў і практычных спецыялістаў. Ад ГДУ слова мелі на ёй кандыдат гістарычных навук, дактарант Р.Р.Лазько, які старшынстваваў на адным з пленарных пасяджэнняў, к.г.н. М.М.Мезга, ст.выкладчык кафедры беларускай культуры В.М.Лебедзева.

Праведзеная канферэнцыя стала своеасаблівым штуршком для далейшых даследаванняў важнейшых праблем беларускай дзяржаўнасці.

**Б.ВАЛОДЗІН**

## НА ПІРЭНЕЙСКІМ ПАЎВОСТРАВЕ

У Інстытуце сучаснай тэхнікі сталіцы Партугаліі Лісабона прайшла VIII-ая міжнародная канферэнцыя па электрадынаміцы складаных асяроддзяў.

У канферэнцыі прынялі ўдзел больш за 80 вучоных з 20 краін. Трэба адзначыць, што II-ая міжнародная канферэнцыя гэтай серыі праходзіла ў 1993 годзе ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф.Скарыны.

Беларусь і наш універсітэт прадстаўлялі ў Партугаліі заг.кафедры агульнай фізікі доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Ігар Валянцінавіч Семчанка і намеснік дэкана фізічнага факультэта кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Сяргей Анатольевіч Хахомаў. Імі былі прадстаўлены тры навуковыя даклады, якія апублікаваны ў зборніку работ канферэнцыі. І.В.Семчанка выступіў са спецыяльным дакладам, у якім зрабіў гістарычны агляд даследаванняў гіратропных крышталяў і прадставіў вынікі сумеснай работы вучоных нашага універсітэта і Тэхналагічнага універсітэта г.Хельсінкі (Фінляндыя).

Сярод удзельнікаў канферэнцыі была распаўсюджана інфармацыя аб міжнароднай канферэнцыі "Праблемы ўзаемадзеяння выпраменьвання з рэчывам", якая прысвячаецца 75-годдзю з дня нараджэння былога рэктара ГДУ Барыса Васільевіча Бокуця, і адбудзецца ў Гомелі 23-27 кастрычніка 2001 года.

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты філалагічнага факультэта горача віншуюць з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук на спецыялізаваным Савеце Белдзяржуніверсітэта асістэнта кафедры рускага, агульнага і славянскага моваведства* ***ЛАПІЦКУЮ*** *Надзею Іванаўну (навуковы кіраўнік — прафесар* ***У.І.Коваль****).*

Фестывальны дзённік

# СВЯТА АКРЫЛЕННЯ ДУШ

*Наш город фестивальный и прекрасный*
*Встречать друзей готов, всегда готов...*

Гэтыя паэтычныя радкі, якія прагучалі на ўрачыстым адкрыцці IV Міжнароднага маладзёжнага фестывалю "Арт-сесія. Гомель — 2000" у абласным драмтэатры, вельмі дакладна перадаюць тую шчырую атмасферу, у якой праходзіла ў г.Гомелі свята маладосці, творчасці, дружбы. На яго традыцыйна, вось ужо ў чацвёрты раз сабраў і даўніх, і новых сяброў з розных краін наш універсітэт — ініцыятар правядзення гэтага фестывалю пры падтрымцы Дзяржаўнага камітэта па справах моладзі, міністэрстваў адукацыі і культуры Рэспублікі Беларусь, аблвыканкама і гарвыканкама, маладзёжных арганізацый. Цяпер ён сустракаў гасцей з Даніі, Шатландыі, Расіі, Украіны, Беларусі, Латвіі, Швецыі, Германіі.

Урачыстым парадам удзельнікаў дэлегацый, узняццем флага "Арт-сесіі" пачаўся 26 кастрычніка ў аблдрамтэатры творчы марафон калектываў самых розных жанраў.

— 6 гадоў таму назад энтузіясты з ГДУ імя Ф.Скарыны надалі слову "сесія" новы сэнс, дадаўшы да яе прыстаўку "арт", — сказаў на ўрачыстым адкрыцці фестывалю старшыня яго аргкамітэта, намеснік старшыні аблвыканкама В.С.Ахлесцін. — Цяпер гэта свята маладосці, творчасці і прыгажосці стала пасапраўднаму народным — праходзіць і ў студэнцкіх аўдыторыях, і ў раённых клубах.

Цёпла вітаў удзельнікаў фестывалю, гледачоў рэктар ГДУ прафесар М.В.Селькін.

— Я вельмі рады, — сказаў Міхаіл Васільевіч, — што фестываль дае магчымасць знаходзіць новых сяброў, ён стаў для ўсіх святам зносін, яднання, акрылення душ. Жадаю "на выдатна" здаць гэтую "сесію".

А затым на сцэну выходзілі вакальныя і харэаграфічныя калектывы, салісты, мастацтва якіх узрушала, уздымала настрой. Высокапрафесійнае, пранікнёнае выкананне дэманстравалі лаўрэат многіх міжнародных конкурсаў мужчынскі фальклорны ансамбль "Мурама" (Расія, кіраўнік А.Чэрнікаў), фальклорны ансамбль "Чырвоная горка" (Расія, кіраўнік Л.Калугіна), ансамбль валыншчыкаў з г.Абердзіна (Шатландыя, кіраўнік Ян Далас), аркестр папулярнай танцавальнай музыкі "Tne Favourite Geilidh Dance Band" , (Данія, кіраўнік Міхаэль Скот), народны фальклорны харэаграфічны ансамбль "Радзімічы" (ГДУ, кіраўнік А.Лысянкоў, балетмайстары М.Паздзеева і Н.Марчанка), фальклорны ансамбль "Славяне" (ГДТУ імя П.Сухога, кіраўнік Т.Мурыгіна), ансамбль народнай музыкі "Скарб" (ГДУ, кіраўнік А.Гулай), жаночы і мужчынскі вакальныя ансамблі "Радуга" і "Рок-гарадок" (г.Бранск, кіраўнікі М.Марчанкава, Я.Забелін), група сучаснай харэаграфіі "Квадра" (г.Гомель, кіраўнік І.Асламава), шоў-балет "Таіс" (г.Гомель, А.Якавенка), тэатр танца "Кактэйль" (ГДУ, балетмайстар Т.Барысенка), сольныя выканаўцы Вера Чарняўская, Антон Сотнікаў (ГДУ), многія іншыя калектывы і выканаўцы.

⌘⌘⌘

***Фестывальная праграма была настолькі насычаная, што паглядзець літаральна ўсё аказалася немагчымым: у адзін дзень і нават у той жа час на розных канцэртных пляцоўках г.Гомеля праходзілі гала-канцэрты, таму даводзілася рабіць выбар, чаму аддаць перавагу. Шчыра кажучы, зрабіць гэта было нялёгка. Але гала-канцэрт творчых калектываў "Славянскі вянок" прывабіў мяне асабліва, куды я і трапіла.***

**МАСТАЦТВА – СРОДАК ЗНОСІН, ЯКІ НЕ ПАТРАБУЕ ПЕРАКЛАДУ**

Фестывальны карагод, яркі і шматфарбавы, сабраў разам братоў-славян — беларусаў і рускіх, каб пераканаць іх яшчэ раз у тым, што былое братэрства моцнае і сёння, што ў іх аднолькавыя карані: у роднай зямлі, у роднай мове і ў народным мастацтве, якое жывіць душу. Спляліся ў адно цэлае музыка, песні і танцы славянскіх народаў. Са сцэны грамадска-культурнага цэнтра гучалі рускія і беларускія народныя песні, у якіх чуліся і весялосць, і пранікліва журба па роднай старонцы на чужыне, аб нешчаслівым замужжы далёка ад бацькоўскага дому. А жартоўныя прыпеўкі з элементамі сучаснай танцавальнай музыкі, выкананыя ў суправаджэнні незвычайнага акампанементу — на піле, іншых падручных сродках, так заводзілі гледачоў, што яны гатовы былі пусціцца ў скокі разам з артыстамі. Усё гэта было ў выступленнях расійскіх калектываў: ансамбляў "Мурама" і "Чырвоная горка", беларускіх — ансамбля народнай музыкі "Скарб" (ГДУ), народнага фальклорна-харэаграфічнага ансамбля "Радзімічы" (ГДУ), фальклорнага ансамбля "Славяне" (ГДТУ імя П.Сухога).

Ярка, вобразна ўвасобілі на сцэне народныя абрады бела-

**(Заканчэнне на 4-й стар.)**

Аб вашым заработку

# ЯК ВЫЖЫЦЬ, ЛІЧЫЦЕ САМІ



## ДОЛЖНОСТНЫЕ ОКЛАДЫ ПРОФЕССОРСКО-ПРЕПОДАВАТЕЛЬСКОГО СОСТАВА ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ С 1 ОКТЯБРЯ 2000Г.

| Наименование должностей | Исходный оклад | Повыш. тар.став. за стаж, % | Повыш. тар.став. за стаж, сумма | Должностной оклад |
|---|---|---|---|---|
| **Заведующий кафедрой** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15лет | 58 126р. | 30% | 17 438р. | **75 563р.** |
| имеющ. стаж свыше 10лет | 58 126р. | 20% | 11 625р. | **69 751р.** |
| имеющ. стаж свыше 5лет | 58 126р. | 15% | 8 719р. | **66 844р.** |
| имеющ. стаж свыше 1 года | 58 126р. | 10% | 5 813р. | **63 938р.** |
| имеющ. стаж до 1 года | 58 126р. | 0% | -р. | **58 126р.** |
| **Профессор** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15лет | 54 335р. | 30% | 16 300р. | **70 635р.** |
| имеющ. стаж свыше 10лет | 54 335р. | 20% | 10 867р. | **65 202р.** |
| имеющ. стаж свыше 5лет | 54 335р. | 15% | 8 150р. | **62 485р.** |
| имеющ. стаж свыше 1 года | 54 335р. | 10% | 5 433р. | **59 768р.** |
| имеющ. стаж до 1 года | 54 335р. | 0% | -р. | **54 335р.** |
| **Доцент** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15лет | 45 677р. | 30% | 13 703р. | **59 380р.** |
| имеющ. стаж свыше 10лет | 45 677р. | 20% | 9 135р. | **54 812р.** |
| имеющ. стаж свыше 5лет | 45 677р. | 15% | 6 852р. | **52 528р.** |
| имеющ. стаж свыше 1 года | 45 677р. | 10% | 4 568р. | **50 244р.** |
| имеющ. стаж до 1 года | 45 677р. | 0% | -р. | **45 677р.** |
| **Старший преподаватель** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15лет | 41 040р. | 30% | 12 312р. | **53 352р.** |
| имеющ. стаж свыше 10лет | 41 040р. | 20% | 8 208р. | **49 248р.** |
| имеющ. стаж свыше 5лет | 41 040р. | 15% | 6 156р. | **47 196р.** |
| имеющ. стаж свыше 1 года | 41 040р. | 10% | 4 104р. | **45 144р.** |
| имеющ. стаж до 1 года | 41 040р. | 0% | -р. | **41 040р.** |
| **Ассистент, преподаватель** | | | | |
| имеющ. стаж свыше 15лет | 38 340р. | 30% | 11 502р. | **49 842р.** |
| имеющ. стаж свыше 10лет | 38 340р. | 20% | 7 668р. | **46 008р.** |
| имеющ. стаж свыше 5лет | 38 340р. | 15% | 5 751р. | **44 091р.** |
| имеющ. стаж свыше 1 года | 38 340р. | 10% | 3 834р. | **42 174р.** |
| имеющ. стаж до 1 года | 38 340р. | 0% | -р. | **38 340р.** |

**Доплаты в месяц:**
за ученую степень доктора наук -- (6 мин.з/пл.) – 21 600р. в месяц;
кандидата наук – (3мин. з/пл.) – 10 800р.;
за и.о. декана – (70% от ст.1 разряда) – 5 040р.;
за и.о. зам. декана – (65% от ст.1 разряда) – 4 680р.

# СТЫПЕНДЫЯ СТУДЭНТА

З 1-га кастрычніка г.г. устаноўлены дзяржаўныя стыпендыі для студэнтаў ВНУ у наступных памерах: імянная стыпендыя — 14040 руб.; вучэбныя стыпендыі па выніках сесіі для студэнтаў гуманітарных, эканамічных і педагагічных спецыяльнасцей складаюць пры балах: ад 3,6 да 4,0 — 7200 руб., ад 4,0 да 4,5 — 7920 руб., ад 4,5 да 5,0 — 9360 руб., пры 5,0 — 10800 руб.

Для студэнтаў прыродазнаўча-навуковых і тэхнічных спецыяльнасцей памер стыпендый складае пры балах: ад 3,4 да 4,0 — 7200 руб., ад 4,0 да 4,5 — 8640 руб., ад 4,5 да 5,0 — 10080 руб., пры 5,0 — 11520 руб.

Персанальная стыпендыя савета ВНУ — 9360 руб., сацыяльная — 5760 руб.

Для слухачоў падрыхтоўчага аддзялення з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апякунства бацькоў, стыпендыя выплачваецца ў памеры 4500 руб.

## *З узнагародай!*

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння заг.кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю КАРПЕЙ Тамара Васільеўна ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

⋄⋄⋄

*За шматгадовую плённую навукова-даследчую дзейнасць і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння навуковы супрацоўнік праблемнай навукова-даследчай лабараторыі перспектыўных матэрыялаў ЛЕАНОВІЧ Алена Мікалаеўна ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

⋄⋄⋄

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці дацэнт кафедры экалогіі МОЛАДАВА Лідзія Пятроўна ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

**Слова да жыхароў мікрараёна "ВАЛАТАВА"**

# СПЫНІМ РАЗГУЛ ХУЛІГАНАЎ

Адным з самых прывабных у нашым горадзе за апошнія гады стаў мікрараён "Валатава". Ён радуе сваімі новабудоўлямі, развіццём сучаснай інфраструктуры. На гэта выдзяляюцца значныя дзяржаўныя асігнаванні. Іх эканомнае расходаванне, узвядзенне новых аб'ектаў рознага прызначэння, навядзенне ўзорнага парадку на кожнай вуліцы, каля кожнага дома, арганізацыя культурнага адпачынку людзей сталі пастаянным клопатам гарадскога выканаўчага камітэта і адміністрацыі Чыгуначнага раёна.

У мікрараёне "Валатава" знаходзіцца і шматпавярховы будынак інтэрната Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны. Тут жыве 589 будучых маладых спецыялістаў. Пры крайне абмежаваным фінансавым становішчы рэктарат імкнецца зрабіць усё неабходнае для стварэння ў студэнцкім доме належнага быту, спрыяльных умоў для вучобы і карыснага правядзення вольнага часу. Многае зроблена па добраўпарадкаванню прылягаючай да інтэрната тэрыторыі.

У памяшканні інтэрната створаны Цэнтр культуры і адпачынку "Студэнцкі". Цяпер тут вядзецца рэканструкцыя. Па заканчэнні рамонтных работ гасцінна расчыняцца дзверы цэнтра не толькі для студэнтаў, але і ўсёй моладзі мікрараёна, дзе кожны зможа правесці свой вольны час па ўласнаму густу.

На жаль, добрай справе вельмі часта шкодзіць мясцовае хуліганнё. Вынікам іх дзеянняў становяцца паламаныя дрэвы, патаптаныя клумбы, пабітая шклотара, непрыстойныя надпісы на агароджы і сценах будынкаў і многае іншае, што псуе настрой людзям.

Ад хуліганаў дастаецца таксама інтэрнату і культурнаму цэнтру універсітэта. Іх "размалёўваюць" рознымі фарбамі, камянямі псуюць абліцовачную плітку, наносяць іншую шкоду пабудовам. Вось зусім свежы факт. На другім паверсе культурнага цэнтра, відавочна, падлеткі пабілі шкло для вітражоў. Нанесены страты больш чым на 100 тыс. руб.

Хуліганскаму разгулу трэба пакласці канец. Зрабіць гэта толькі з дапамогай работнікаў праваахоўных органаў вельмі цяжка. Тут патрэбны неадкладныя і дзейсныя намаганні шырокай грамадскасці ўсяго мікрараёна "Валатава". Перш за ўсё аб сваіх дзецях павінны патурбавацца іх бацькі, у выхаваўчым працэсе паказаць асабісты прыклад як у паводзінах, так і ў адносінах да ўсяго акаляючага .

Давайце ж сумесна зробім свой мікрараён сапраўды ўзорным у шырокім сэнсе гэтага слова.

Засцяражэм сваіх дзяцей ад злачынных учынкаў. Створым ім усе ўмовы для духоўнага ўзбагачэння, гарманічнага развіцця, паўнацэннага культурнага адпачынку.

**Рэктарат Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф.Скарыны.**

# ЭКАЛОГІЯ ПАТРАБУЕ НАВУКОЎЦАЎ



**Узгадваецца мічурынскае выслоўе: "Мы не можам чакаць міласціны ад прыроды, узяць яе ў рукі — наша задача". Сёння няма патрэбы апавядаць, наколькі разумна і эфектыўна вырашалася гэтая найскладанейшая праблема. Адна толькі чарнобыльская трагедыя, яе наступствы пераканаўча адказваюць на шматлікія пытанні. Гэта суровы ўрок як для цяперашняга, так і будучых пакаленняў.**

**Паспешнасць, лёгкадумнасць у дачыненні да прыроды ў любы час могуць абярнуцца нязмернай бядой. Таму да ўсіх прыродных працэсаў трэба падыходзіць на глыбока абгрунтаванай навуковай аснове. У гэтай сувязі асаблівае значэнне набывае падрыхтоўка высокакваліфікаваных навуковых кадраў і перш за ўсё ў галіне экалогіі.**

**Што ж у дадзеным накірунку зроблена і ажыццяўляецца ў Палескім рэгіёне, найбольш пацярпелым ад чарнобыльскай катастрофы?**

**Расказвае прарэктар па навуковай рабоце Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны, д.т.н., прафесар Д.Р.Лін:**

— Ва ўсіх ВНУ Гомельскага рэгіёна цяпер ёсць вучэбна-навуковыя падраздзяленні біялагічнага профілю. Так, у нашым універсітэце — біялагічны факультэт, у Гомельскім дзяржаўным медінстытуце — шэраг кафедр агульна-біялагічнай накіраванасці, Мазырскім дзяржаўным педінстытуце імя Н.К.Крупскай, Беларускім дзяржуніверсітэце транспарту, Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце імя П.О.Сухога — кафедры экалогіі. Акрамя таго, у Гомелі паспяхова працуюць навукова-даследчыя інстытуты радыялогіі Міністэрства надзвычайных сітуацый і радыяцыйнай медыцыны Міністэрства аховы здароўя Беларусі. На Гомельшчыне плённа працуе таксама шэраг аграбіялагічных і сельскагаспадарчых доследных станцый і ўчасткаў.

У ВНУ, навукова-даследчых і вытворчых арганізацыях нашага рэгіёна вядуць падрыхтоўку маладых спецыялістаў і заняты навуковай дзейнасцю звыш 30 дактароў навук, прафесараў, сярод якіх акадэмік і член-карэспандэнт НАН Беларусі, і больш за 60 кандыдатаў навук, дацэнтаў. У аспірантурах па біялагічных спецыяльнасцях навучаецца звыш 40 аспірантаў. Да таго ж дысертацыйныя работы выконваюць каля 30 саіскальнікаў вучоных ступеняў.

Вынікі даследаванняў вучоных Гомельшчыны атрымалі шырокае прызнанне вядучых спецыялістаў біялагічнай навукі, аб чым сведчаць іх шматлікія манаграфіі і падручнікі з грыфам Міністэрства адукацыі, публікацыі ў цэнтральным навуковым друку, зборнікі навуковых прац, шырокія і трывалыя кантакты з навуковымі ўстановамі і асобнымі вядомымі навукоўцамі Беларусі, блізкага і далёкага замежжа — Расіі, Украіны, Польшчы, Германіі, Аўстрыі, іншых краін.

На сённяшні дзень істотныя напрацоўкі па біялогіі, у прыватнасці, экалогіі маюць навукоўцы Брэсцкай і Магілёўскай абласцей, якія таксама ў вялікай ступені пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Складаная экалагічная сітуацыя паставіла задачу больш інтэнсіўнай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных навуковых кадраў біялагічнага профілю. З гэтай мэтай па ініцыятыве рэктарата нашага універсітэта сёлета пры ГДУ нядаўна створаны рэгіянальны Савет па абароне дысертацый на атрыманне вучонай ступені кандыдата біялагічных навук па спецыяльнасці 03.00.16 — экалогія.

Старшынёй названага Савета зацверджаны д.б.н., член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі, прафесар кафедры батанікі і фізіялогіі раслін ГДУ Л.М.Сапегін, яго намеснікам — рэктар Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Н.К.Крупскай д.б.н., прафесар В.В.Валетаў, вучоным сакратаром — к.б.н., дацэнт, заг.кафедры батанікі і фізіялогіі раслін ГДУ В.М.Храмчанкова. У склад Савета ўвайшлі таксама доктар медыцынскіх навук, рэктар Гомельскага дзяржаўнага медінстытута С.У.Жаваранак, д.б.н., заг.сектара радыяцыйнага мадэлявання і прагназіравання лясных экасістэм Інстытута лесу НАН Беларусі А.М.Дворнік, доктар сельскагаспадарчых навук, дырэктар Гомельскай птушкафабрыкі А.Ф.Карпенка, к.б.н., дацэнт, дэкан біялагічнага факультэта В.І.Талкачоў, д.м.н., прафесар кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін А.С.Калугін, к.б.н., дацэнт кафедры батанікі і фізіялогіі раслін М.М.Дайнэка (ГДУ).

Трэба заўважыць, што ўсе члены спецыялізаванага Савета маюць значныя навуковыя працы экалагічнага накірунку. Асаблівая ўвага ў іх звернута на радыеэкалогію Гомельскага рэгіёна.

**На пытанне аб галінах даследаванняў, па якіх могуць быць выкананы дысертацыйныя работы, адказвае старшыня спецыялізаванага Савета Л.М.Сапегін:**

— На мой погляд, вельмі важна абгрунтаваць агульныя заканамернасці ўзаемаадносін жывых істот паміж сабой і акаляючым асяроддзем, дынаміку папуляцый, структуру біяцэнозаў і вытлумачыць шляхі захавання пэўнага віда ў тых умовах, якія пастаянна мяняюцца.

Значную каштоўнасць мае вывучэнне ўзаемаадносін паміж раслінамі і жывёламі, узаемадзеяння на іх фактараў акаляючага асяроддзя, распаўсюджвання захворванняў сярод жывёлін і раслін, вызначэнне мерапрыемстваў па барацьбе з імі.

Знойдуць адабрэнне і даследаванні аб уздзеянні на жывыя арганізмы натуральнай і штучнай радыеактыўнасці і радыеэкалагічны маніторынг біясферы.

Ад маладых даследчыкаў мы чакаем усебаковай ацэнкі экалагічнай абстаноўкі і параметраў міграцый арганічных і неарганічных хімічных таксікантаў у прыродных аб'ектах, на якія паўздзейнічала тэхнагеннае забруджанне.

Да ліку самых неадкладных і актуальных адносяцца праблемы змененых чалавекам ландшафтаў, распрацоўкі стратэгіі пераадолення надзвычайных сітуацый у натуральных экасістэмах, мерапрыемстваў па ахове прыроды і рацыянальнаму прыродакарыстанню.

Нарэшце, мы павінны глабальна спазнаць экалогію чалавека, уздзеянне экалагічных фактараў на змяненні параметраў жыццядзейнасці чалавечага арганізма.

**Інтэрв'ю ўзяў У.БАЛОГА.**

## Імёны на карце свету




# ДАСЛЕДЧЫК СІБІРЫ

У 2000 годзе споўнілася 155 гадоў з дня нараджэння выдатнага беларускага геолага, палеантолага і географа, даследчыка Сібіры Івана Дзяменцьевіча (Яна Дамінікавіча) Чэрскага.

З апошняга курса Віленскага дваранскага інстытута ён быў высланы ў 1863 годзе за ўдзел у польскім паўстанні ў Сібір спачатку радавым, а затым з 1871 года — на пасяленне ў Іркуцк.

Пад уздзеяннем П.П.Сямёнава-Цян-Шанскага пачаў геалагічныя і палеанталагічныя даследаванні. Вывучаў Саяны, Прысаянне, Прыангар'е, берагі Байкала, басейн ракі Сяленгі і раку Ніжнюю Тунгуску.

І.Д.Чэрскі вылучыў ідэю эвалюцыйнага развіцця рэльефу. Прапанаваў адну з першых палеатэктанічных схем Сібіры.

У 1885 годзе быў амністыраваны і па запрашэнні Акадэміі навук пераехаў у Пецярбург. У 1891 годзе наладзіў экспедыцыю ў раён рэк Калымы і Індзігіркі. Памёр у нізоўях Калымы ў 1892 годзе.

Іменем І.Д.Чэрскага названы горная краіна ў Якуціі і Магаданскай вобласці, хрэбет у Забайкаллі.

**Аляксандр САКАЛОЎ, студэнт гр.ЭК-11 геолага-геаграфічнага факультэта.**

Паштовая марка, прысвечаная І.Д.Чэрскаму, выпушчаная ў 1995 годзе ў Беларусі.

**Канферэнцыі**

# КАБ ВЫРАШАЦЬ ПРАБЛЕМЫ ШКОЛЫ

У нашым універсітэце адбылася абласная навукова-метадычная канферэнцыя "Праблемы выкладання агульнаадукацыйных дысцыплін у сярэдняй школе і на факультэце давузаўскай падрыхтоўкі", арганізатарам якой з'яўлялася кафедра давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі. У яе рабоце прынялі ўдзел выкладчыкі ГДУ, Мазырскага педагагічнага інстытута імя Н.К.Крупскай, настаўнікі школ і ліцэяў г.Гомеля.

Адкрыў канферэнцыю рэктар ГДУ прафесар М.В.Селькін, які адзначыў, што маладая універсітэцкая кафедра, якую ўзначальвае доктар тэхнічных навук І.М.Елісеева, з'явілася першаадкрывальніцай падобных канферэнцый у рэспубліцы. Ён засяродзіў увагу на праблемах, якія існуюць сёння ў сярэдніх школах: перагрузка школьнікаў вучэбнымі заняткамі (шасцігодкі займаюцца па 5-6 урокаў за дзень), нездавальняючы стан здароўя падрастаючага пакалення (70 % маюць розныя захворванні). Таму была выказана надзея, што вынікі канферэнцыі дапамогуць выпрацаваць рэкамендацыі па пытаннях карэкціроўкі выкладання агульнаадукацыйных дысцыплін, метадычнай работы настаўнікаў-прадметнікаў, што дасць вучням больш самастойнасці ў авалодванні ведамі. Адзначалася таксама, што добра падрыхтаванымі як у практычным, так і тэарэтычным планах з'яўляюцца на сённяшні дзень выпускнікі ліцэяў, профільных класаў, слухачы падрыхтоўчых аддзяленняў.

Усе праблемы, якія з'яўляюцца актуальнымі для сённяшняй школы, знайшлі адлюстраванне і ў дакладах удзельнікаў канферэнцыі, якія былі прачытаны ў сямі секцыях.

Выдадзены зборнік матэрыялаў канферэнцыі, які прызначаны для арганізацыі вучэбнай і навукова-метадычнай работы выкладчыкаў школ і факультэта давузаўскай падрыхтоўкі, абагульнення перадавога педагагічнага вопыту. У ім асветлены пытанні, на якія неабходна звярнуць увагу выкладчыкам пры падрыхтоўцы навучэнцаў профільных і ліцэйскіх класаў, слухачоў факультэта давузаўскай падрыхтоўкі да уступных экзаменаў у ВНУ.

**Т.АЎДОНІНА, дацэнт кафедры давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі.**

# САМЫЙ ЛУЧШИЙ ПУТЬ ТОТ, КОТОРЫЙ ОТКРЫВАЕТ НАМ НОВЫЕ ПУТИ



В университете работает лаборатория прикладной психологии, предоставляющая возможность каждому получить консультацию, стать участником психологического семинара-тренинга, психологического театра, психологического клуба.

Психологи-консультанты помогут вам выявить собственные внутренние ресурсы, в результате чего вы не только разрешите те или другие проблемы, затруднения, но и определите направления своего дальнейшего самосовершенствования.

Ведущие тренинговых групп удивительным образом сочетают легкость формы и глубину содержания: придя на тренинг, вы окунетесь в атмосферу праздника, а покидая, окажетесь загруженными размышлениями о себе, бытие, своем месте в мире.

Руководитель психологического театра — это и режиссер, и психолог в одном лице, а сам театр — групповой психотерапевтический процесс, где драматическая импровизация служит для исследования внутреннего мира и для улучшения адаптивности к миру внешнему.

**Индивидуальное психологическое консультирование осуществляется ежедневно с понедельника по пятницу с 10⁰⁰ до 17⁰⁰.**

*Психологические семинары-тренинги проводятся еженедельно по субботам с 10⁰⁰ до 16⁰⁰, занятия в психологическом театре — по понедельникам и средам с 17³⁰ до 20⁰⁰.*

**По пятницам еженедельно всех, кого интересует психология, приглашает студенческий психологический клуб. Начало работы в лаборатории с 18⁰⁰.**

Записаться на консультацию, в группу семинара-тренинга, психологический театр и психологический клуб можно по телефону 57-94-79 или непосредственно посетив лабораторию, которая находится в здании санатория-профилактория университета, к.31.

**Тематика семинаров-тренингов в ноябре 2000 года следующая:**

9 ноября. Мастер-класс "Программы развития личности в работе школьного психолога" (Р.М.Миневич, г.Мозырь).

11 ноября. Мастер-класс по экзистенциальной психотерапии (Г.В.Гатальская).

18 ноября. Тренинг ассертивности (А.В.Крыленко).

25 ноября. Семинар-тренинг по управлению стрессом (А.В.Крыленко).

25 ноября. Мастер-класс "Психотерапия пограничных состояний" (Л.В.Рузанова, психотерапевт).

18-19 ноября. Фестиваль психологических театров. Участники: психологические театры ("Лютея" БГУ, Минск), ГГУ им.Ф.Скорины, педагогического колледжа им. Л.С.Выготского, СШ № 56.

Лаборатория прикладной психологии приглашает вас пройти часть пути личностного роста, став участником различных программ, организуемых лабораторией. Пусть ступеньками на вашем пути будут: стремление понимать себя и других людей, привычка смотреть на мир реалистично, забота о том, чтобы в душе не гас источник света и любви.

**Л.МОИСЕЕНКО, психолог, участник тренинговых групп.**

**Фестывальны дзённік**

# СВЯТА АКРЫЛЕННЯ ДУШ

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.)

русаў удзельнікі народнага тэатра фальклорнай песні "Пасад" (ГДУ).

А сапраўднай зорачкай праграмы, якая літаральна зачаравала ўсіх сваім выступленнем, была маленькая артыстка з г.Кобрына Волечка Сацюк, прызёр рэспубліканскага фестывалю "Усе мы родам з дзяцінства".

## УСЕ МЫ — СТУДЭНТЫ!

**Любы фестываль набывае свае адметныя традыцыі. Конкурс "Alma mater" з'явіўся сёлета ў праграме "Арт-сесіі" упершыню. Гэтым тлумачыцца павышаная цікавасць да яго ўсіх студэнтаў г.Гомеля. У папярэдніх фестывалях моладзь гомельскіх вышэйшых навучальных устаноў станавілася толькі пабочным сузіральнікам, а не актыўным саўдзельнікам "Арт-сесіі". Цяпер, як кажуць, "лёд крануўся", студэнцтва горада далучылася да свята творчасці.**

На конкурс, які прайшоў у актавай зале ГДУ, па 2 прадстаўнікі — дзяўчыну і юнака — вылучылі наш універсітэт (Таццяна Ушакова і Руслан Сарокін), медінстытут (Алена Аляксандрава і Юрый Ермакоў), тэхнічны універсітэт імя П.Сухога (Ірына Нікіфарава і Дзяніс Давыдаў), каапературны інстытут (Вольга Дзікан і Аляксандр Конанаў), Гомельскі філіял міжнароднага недзяржаўнага інстытута працоўных і сацыяльных адносін (Алена Гулевіч і Сяргей Чукавенкаў). На жаль, не прыняў удзел у конкурсе, як планавалася, БелДУТ.

Alma mater — родны дом для студэнта, у сценах якога праходзяць самыя лепшыя гады яго жыцця. Таму вельмі важна, каб тут і вучыцца было цікава, і вольны час праводзіць весела, з карысцю для духоўнага росту. А яшчэ немалаважна бліжэй даведацца адзін пра аднаго, каб абменьвацца ўсім лепшым, што ёсць у кожнай навучальнай установе, як кажуць, "сябраваць дамамі". Такую мэту і ставіў перад сабой культурны цэнтр ГДУ, які стаў ініцыятарам конкурсу "Alma mater".

Кожнай пары трэба было прайсці нялёгкае выпрабаванне на студэнцкую кемлівасць, прадэманстраваць артыстызм, незгасальную маладую энергію, талент падчас пяці конкурсаў, не звязаных паміж сабой, — літаратурнага, рэкламнага, на складанне лепшай калекцыі, а таксама здаць экзамен на сесіі і паказаць дамашняе заданне.

Пасля першага з іх лідэрства захапілі нашы студэнты Т.Ушакова і Р.Сарокін, якія атрымалі заахвочвальны прыз — білеты на канцэрт Земфіры, які адбудзецца ў бягучым месяцы ў Лядовым палацы.

Выдатна справіліся з заданнем другога конкурсу — рэкламай сваёй ВНУ -- студэнты-медыкі, якім уручылі відэакасеты і кнігі.

А вось трэці па ліку конкурс гледачы без слёз ад смеху глядзець не маглі. Студэнты "здавалі экзамен" па тэмах, накшталт, "Чортавы кулічкі, як свабодная эканамічная зона", "Край свету, як месца зімоўкі ракаў" і г.д. Гэта была сапраўдная імправізацыя з удзелам яшчэ дзвюх дзеючых асоб (ролю экзаменатараў выконвалі А.Аўсеенка і В.Гатальскі). Адзнака "выдатна" за здадзены экзамен была пастаўлена зноў жа студэнтам медінстытута, якія атрымалі за гэты конкурс чарговы сувенір — гадзіннік, які будзе адлічваць час ад адной "Арт-сесіі" да другой.

Чацвёрты конкурс унёс у глядзельную залу незвычайнае ажыўленне, бо яго ўдзельнікі выбіралі менавіта з гледачоў аб'екты для сваіх калекцый (акуляраў, прычосак, гальштукаў, джынсаў, вусоў). Не ўсім канкурсантам, на жаль, хапіла пачуцця меры, такту і этыкі ў прадстаўленні сваіх калекцый, і зноў усё ж тыя медыкі ўсе правілы і нормы ў гэтым плане вытрымалі, і не без належнага гумару, за што іх аб'явілі пераможцамі ў чарговы раз.

Дамашняе заданне — інсцэніроўка самых смешных урыўкаў з вядомых кінакамедый "Іван Васільевіч мяняе прафесію", "Карнавал", "Добры дзень, я ваша цётка". "Няўлоўныя мсціўцы" і інш. — было вельмі відовішчным, з цудоўнымі касцюмамі, дэкарацыямі, акрабатычнымі трукамі і інш. Кожная ВНУ справілася з ім на вышэйшым узроўні, і членам журы было вельмі цяжка вызначыць пераможцу. Пасля доўгіх роздумаў і ваганняў лепшым было названа дамашняе заданне студэнтаў ГДУ, якія паказалі сцэну з донай Розай "з Бразіліі, дзе шмат дзікіх малпаў".

Каб вызначыць абсалютнага пераможцу конкурсу, журы трэба было дадаткова параіцца, бо склалася даволі трагічная сітуацыя — будучыя медыкі і студэнты ГДУ набралі аднолькавую колькасць балаў. Давялося даць ім яшчэ дадатковы шанс: невялічкае заданне — праспяваць што-небудзь акапэльна перад мікрафонам без часу на падрыхтоўку. Вакальны конкурс расставіў кропкі над "і". Пераможцамі назвалі студэнтаў медінстытута, якія атрымалі гран-пры — відэаплэер.

**Т.ДУБЯК.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

**(Працяг фестывальнага дзённіка чытайце ў наступным нумары нашай газеты).**



**Выступае мужчынскі фальклорны ансамбль "Мурама" (Расія)-- уладальнік Гран-пры міжнародных конкурсаў выканаўцаў народнай песні.**

# АНДРЭЙ МАКАЁНАК: ЗНАЁМЫ НЕЗНАЁМЕЦ

**Да 80-годдзя з дня нараджэння вялікага беларускага камедыёграфа**



У мастацтве шмат значыць маштаб асобы. Шэрасць ніколі не здольная на вялікі мастацкі плён, бо толькі людзі напружанага духоўнага пошуку, абвостранай душэўнай відушчасці і велізарнага крэатыўнага асобаснага зараду ў стане апярэдзіць свой час, стварыць такія шэдэўры, якія з'яўляюцца ўвасабленнем гістарычнай эпохі. З кагорты такіх пасіянарыяў і Андрэй Ягоравіч Макаёнак, наш зямляк, ураджэнец вёскі Борхаў Рагачоўскага раёна. 12 лістапада драматургу споўнілася б 80 гадоў.

Ён быў незвычайным, неардынарным чалавекам. Выдатныя артыстычныя і мастацкія (лепка, разьбярства, малюнак) здольнасці; тонкі эстэтычны густ; назіральнасць; прамы (часам да рэзкасці), адкрыты, моцны, шчыры характар; нястрымны асобасны тэмперамент, абаяльнасць — невераемныя. Ну ці ж можа гэты "музейны" пералік стварыць хаця б слабую ілюзію падабенства да ўнікальнага характару А.Макаёнка? Не. Ніякія словы ніколі не будуць лепшыя за тое, што яны абазначаюць. А гэта быў вялікі Чалавек, вялікі Творца, магутны талент. Гэта быў Майстра самага цяжкага літаратурнага цэха — драматургічнага.

Зусім не дарэмна называў драму *вышэйшым* родам літаратуры такі карыфей сусветнай думкі, як Гегель. Мастацтва драмы патрабуе ад творцы абазначанасці ў тонкасцях двух відаў мастацтва — літаратуры і тэатра. Гэта гранічна ўскладняе задачу драматычнага пісьменніка, бо адна справа — пісаць **проста** тэксты, прызначаныя для чытання, а зусім іншае — ствараць асновы сцэнічнага дзеяння. Выявіць праўду жыцця **толькі** праз дыялогі персанажаў. Як гэта складана! Вось і атрымліваецца, што драматургаў на белым свеце тысячы, а "абраных" — адзінкі. Андрэй Макаёнак здолеў пранікнуць у таямніцы таямніц гэтага рамяства, увайсці ў лік нешматлікіх асоб, абраных Яе Вялікасці Драмы.

Андрэй Макаёнак — драматург сусветнага маштабу. Гэта просты, звычайны, непарушны факт. Так, яго творчасць — прадаўжэнне савецкага ладу, а сам Макаёнак быў прававерным камуністам. Але мастацкая геніяльнасць лёгка перасягае тэндэнцыйнасць. Рэч зноў жа ў маштабе асобы. Драбната блытаецца ў абумоўленых часам ідэалагічных рамках, геніі проста і натуральна перарастаюць гэтыя рамкі. Скажам, макаёнкаўскі "Трыбунал" (1970) у свой час выклікаў эфект выбуху бомбы. Ідэалагічна ангажаваныя літаратары чаўралі, як выкінутыя на бераг рыбіны. "Падрыў устояў! Смех з савецкага патрыёта! Здзек з героя!" А гэта быў бліскучы эксперымент па спалучэнні на першы погляд неспалучальнага: стыхій трагічнага і камічнага. Эксперымент завяршыўся трыумфальным поспехам. І не толькі беларускай літаратуры, а і ўсёй савецкай драматургіі, смелым прарывам у накірунку сінтэзу эстэтычных катэгорый, што адкрывала перад драмай новыя патэнцыяльныя магчымасці.

Філасофская трагікамедыя "Зацюканы апостал" (1969) толькі ў савецкі час лічылася крытыкай Захаду. Цяпер жа яна ўспрымаецца як агульначалавечая сага пра заганы і хібы чалавека і грамадства. А філасофскія сатырычныя камедыі "Святая прастата" ("Кашмар") (1974) і "Дыхайце эканомна" (1982)? Гэта ж напісана пра нас, пра наш час.

Ды зрэшты нават з адным "Трыбуналам" ды "Зацюканым апосталам" драматург трыумфальна ўвайшоў бы ў гісторыю беларускай літаратуры. Бо гэтыя творы — этапныя для нашага мастацкага слова. Ды і сама постаць Андрэя Макаёнка — таксама з'ява этапная, значная. Такія драматургі "міласцю божай" нараджаюцца нячаста. Беларускай нацыі ў XX стагоддзі, хоць у гэтым, пашанцавала і не абы-як. Такія людзі, як Андрэй Макаёнак — сведчанне творчай жыццяздольнасці нацыі. Плён яго працы назаўсёды застаўся ў актыве найвышэйшых мастацкіх дасягненняў беларусаў. Мастак пайшоў у вечнасць, назаўжды пакінуўшы нам свае шэдэўры. Ушануем жа яго памяць. Найлепш — калі пацікавімся яго творамі. Вось ён, перад намі — жывы, жыццярадасны, энергічны, непрадказальны, тэмпераментны, з'едлівы, гумарыстычны (часам да салёнага) у сваіх творах. Чытайце. Знаёмцеся.

**Д.МАМАЧКІН, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры.**

**Спорт**



## ЗНОЎ ПОСПЕХ

Кафедра спартыўных дысцыплін нашага універсітэта працягвае адзначаць 2000-ы год значнымі перамогамі. Адна з іх дасягнута на нядаўна прайшоўшым у г.Мінску чэмпіянаце Рэспубліканскіх студэнцкіх гульняў па валейболу сярод мужчынскіх каманд.

Валейбалісты ГДУ (трэнер У.У.Макарэвіч) у фінальным турніры атрымалі 5 перамог. Упартае супраціўленне ім здолелі аказаць толькі студэнты Акадэміі фізічнага выхавання і спорту і Брэсцкага дзяржуніверсітэта. У выніку заваяваны вышэйшыя ўзнагароды чэмпіянату.

У бягучым месяцы таксама ў сталіцы нашай краіны адбудуцца фінальныя спаборніцтвы па баскетболу. Пажадаем жа і нашым баскетбалістам узняцца на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару.

**Б.ГІЛЬ, дырэктар спартклуба.**

**Конкурс "Ану, першакурснік-2000!"**

## НА П'ЕДЭСТАЛ УЗЫШЛІ МАТЭМАТЫКІ



На працягу двух вечароў у актавай зале універсітэта доўжыўся традыцыйны конкурс "Ану, першакурснік-2000!". Ён праходзіў пад эгідай "Свята, якое заўсёды з намі". І гэта было сапраўднае свята агляду юных талентаў. Аб яго вартасцях на старонках нашай газеты падрабязна раскажуць спецыялісты. Мы ж пакуль што паведамім, як размеркаваліся занятыя на конкурсе месцы. Яго пераможцамі сталі будучыя матэматыкі. Студэнты-гісторыкі — другія. Трэцяе месца падзялілі эканамічны і біялагічны факультэты. Услед за імі размеркаваліся факультэты замежных моў, філалагічны, фізічнай культуры і фізічны. На апошніх радках своеасаблівай "турнірнай табліцы" студэнты геолага-геаграфічнага і юрыдычнага факультэтаў, аддзялення псіхалогіі.

Звыш 20 лепшых удзельнікаў конкурсу сталі яго лаўрэатамі і ўдастоены каштоўных падарункаў спонсараў творчага мерапрыемства. Сярод вызначаных талентаў — першакурснікі А.Леснікава з эканомфака, В.Качан і В.Волкава з філфака, будучыя гісторыкі Н.Кальчук, А.Кошалеў і іншыя выканаўцы розных жанраў.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

**— матэматычнага аналізу — асістэнта;**

**— рускай літаратуры — асістэнта;**

**— агульнай фізікі — асістэнта.**

**Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.**

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

## УДАКЛАДНЕННЕ

У артыкуле "Хто які гаспадар?", які быў надрукаваны ў папярэднім нумары нашай газеты, дапушчана недакладнасць. Факт наяўнасці ў работніка ГДУ Цурганава чатырох зямельных участкаў у дачным кааператыве "Сосны", як было напісана ў газеце, не адпавядае сапраўднасці. Такая няправільная інфармацыя была выкладзена на пасяджэнні прафкома ГДУ, які разглядаў работу універсітэцкіх садова-агародных кааператываў.

Калектыў кафедры эканамічных тэорый выказвае глыбокае спачуванне асістэнту Дзмітрыю Рыгоравічу **КАЗЛОВУ** ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю **БАЦЬКІ**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Песіна, 80, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар
Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 606
Падпісана да друку 3.11.2000